ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 2 (526) | Субота, 15 студзеня 1983 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

### аб пленуме Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі

13 студзеня адбыўся нечарговы пленум ЦК Кампартыі Беларусі, які разгледзеў арганізацыйнае пытанне.

Першым сакратаром Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі выбран тав. Слюнькоў Мікалай Мікітавіч. Доўгі час ён працаваў у Беларусі на розных участках партыйнага і гаспадарчага будаўніцтва. Апошнія гады з'яўляўся намеснікам старшыні Дзяржплана СССР.

У рабоце пленума прыняў удзел сакратар ЦК КПСС І. В. Капітонаў.

## Ад Цэнтральнага Камітэта КПСС, Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР і Савета Міністраў СССР

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР і Савет Міністраў СССР з глыбокім жалем паведамляюць, што 11 студзеня 1983 г. пасля цяжкай працяглай хваробы памёр вядомы дзеяч Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы, кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі, член Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, Герой Сацыялістычнай Працы Кісялёў Ціхан Якаўлевіч.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КПСС | ПРЭЗІДЫУМ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР | САВЕТ МІНІСТРАЎ СССР



## Ад Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР і Савета Міністраў БССР

Цэнтральны Камітэт КП Беларусі, Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР і Савет Міністраў БССР з глыбокім жалем паведамляюць камуністам, усім працоўным рэспублікі, што 11 студзеня 1983 года пасля цяжкай працяглай хваробы памёр Ціхан Якаўлевіч Кісялёў — вядомы дзеяч Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы, буйны кіраўнік і арганізатар партыйнага і савецкага будаўніцтва ў Беларусі, кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, член Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, першы сакратар Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КАМПАРТЫІ БЕЛАРУСІ | ПРЭЗІДЫУМ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР | САВЕТ МІНІСТРАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР

# Ціхан Якаўлевіч КІСЯЛЁЎ

11 студзеня 1983 года пасля цяжкай і працяглай хваробы памёр кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі, член Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Ціхан Якаўлевіч Кісялёў. Не стала сярод нас вядомага дзеяча Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы, жыццё якога цалкам аддадзена вялікай справе будаўніцтва камунізму.

Ціхан Якаўлевіч Кісялёў нарадзіўся 12 жніўня 1917 г. у вёсцы Агародня цяпер Добрушскага раёна Гомельскай вобласці ў беднай сялянскай сям'і. Член КПСС з 1940 года. Скончыў Гомельскі педагагічны інстытут і ВПШ пры ЦК КПСС. Доўгі час працаваў настаўнікам, загадчыкам навучальнай часткі сямігадовай, дырэктарам сярэдняй школы. З 1944 года Ціхан Якаўлевіч Кісялёў на партыйнай рабоце. Быў інструктарам Гомельскага абкома партыі, кіраўніком лектарскай групы Брэсцкага абкома, намеснікам загадчыка, загадчыкам аддзела прапаганды і агітацыі ЦК Кампартыі Беларусі. З 1952 года Ц. Я. Кісялёў з'яўляўся першым сакратаром Брэсцкага абкома партыі, затым сакратаром і другім сакратаром Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі. На працягу амаль дваццаці гадоў ён працаваў Старшынёй Савета Міністраў Беларускай ССР. Тут ярка раскрыліся ўласцівыя Ціхану Якаўлевічу Кісялёву выдатныя якасці таленавітага партыйнага і савецкага кіраўніка. Ім многае зроблена па мабілізацыі працоўных на аднаўленне разбураных у гады вайны гарадоў, сёл, прамысловых прадпрыемстваў, калгасаў, саўгасаў, па далейшаму развіццю прадукцыйных сіл рэспублікі. За гэтыя гады ў Беларусі створаны новыя галіны эканомікі, на высокія рубяжы выйшла сельская гаспадарка, ажыццёўлены вялікія сацыяльныя пераўтварэнні.

З 1978 года Ц. Я. Кісялёў працаваў намеснікам Старшыні Савета Міністраў СССР. У кастрычніку 1980 г. Ціхан Якаўлевіч Кісялёў быў выбран першым сакратаром ЦК Кампартыі Беларусі. Ён з XXII з'езда партыі з'яўляўся членам Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. З кастрычніка 1980 г. Ц. Я. Кісялёў кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС. Ён выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР чацвёртага і наступных скліканняў, з чэрвеня 1981 г. — член Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

Ціхан Якаўлевіч Кісялёў на ўсіх участках, куды яго накіроўвала партыя, праяўляў творчасць і ініцыятыву ў ажыццяўленні палітыкі КПСС. Яго вызначалі высокая кампетэнтнасць і эрудыцыя, прынцыповасць і дзелавітасць, увага і чуласць да людзей, асабістае абаянне і скромнасць. Усё гэта здабыло Ціхану Якаўлевічу шырокае прызнанне і аўтарытэт.

За вялікія заслугі перад Камуністычнай партыяй і Савецкай дзяржавай Ц. Я. Кісялёву ў 1977 годзе прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Ён узнагароджан пяццю ордэнамі Леніна, ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, «Знак Пашаны» і многімі медалямі.

Светлая памяць аб Ціхане Якаўлевічу Кісялёве, верным сыне ленінскай партыі і савецкага народа, палымяным патрыёце і камунісце, назаўсёды захаваецца ў сэрцах савецкіх людзей.

Ю. У. АНДРОПАЎ, Г. А. АЛІЕЎ, М. С. ГАРБАЧОЎ, В. В. ГРЫШЫН, А. А. ГРАМЫКА, Д. А. КУНАЕЎ, А. Я. ПЕЛЬШЭ, Р. В. РАМАНАЎ, М. А. ЦІХАНАЎ, Д. Ф. УСЦІНАЎ, К. У. ЧАРНЕНКА, У. В. ШЧАРБІЦКІ, П. Н. ДЗЕМІЧАЎ, У. І. ДАЛГІХ, В. В. КУЗНЯЦОЎ, Б. М. ПАНАМАРОЎ, Ш. Р. РАШЫДАЎ, М. С. САЛОМЕНЦАЎ, Э. А. ШЭВАРДНАДЗЕ, М. В. ЗІМЯНІН, І. В. КАПІТОНАЎ, К. В. РУСАКОЎ, М. І. РЫЖКОЎ, Т. М. МЕНТЭШАШВІЛІ, А. Н. АКСЁНАЎ, В. Г. БАЛУЕЎ, У. І. БРОВІКАЎ, М. І. ДЗЕМЯНЦЕЙ, Я. П. ІВАНОЎСКІ, Ю. Б. КОЛАКАЛАЎ, А. Т. КУЗЬМІН, М. І. ЛАГІР, У. А. МІКУЛІЧ, У. Ф. МІЦКЕВІЧ, М. Н. ПОЛАЗАЎ, І. Я. ПАЛЯКОЎ, Л. С. ФІРЫСАНАЎ, Ю. М. ХУСАІНАЎ, І. Ф. ЯКУШАЎ, У. Е. ЛАБАНОК, Н. Л. СНЯЖКОВА, У. П. ШАПЛЫКА, Л. Г. КЛЯЦКОЎ, А. А. МАЛАФЕЕЎ, В. В. ПРЫШЧЭПЧЫК, Я. Я. САКАЛОЎ, С. М. ШАБАШОЎ, Г. Г. БАРТАШЭВІЧ, М. А. БАРЫСЕВІЧ, Л. Д. БРЫЗГА, Я. І. КЛІМЧАНКА, У. Л. БЯДУЛЯ, Я. І. СКУРКО (МАКСІМ ТАНК).

